Дайджэст

ЛГБТ-ТЭМАТЫКА Ў БЕЛАРУСКІХ МАСМЕДЫЯ

Аўтар: GayPress.eu

красавік – чэрвень 2020

Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі, прызначаныя на 9 жніўня 2020 года, адкладаюць свой адбітак на ўсю медыяпавестку краіны.

Восем беларускіх ЛГБТ-праектаў і ініцыятываў апублікавалі Зварот ЛГБТ-праектаў і ініцыятываў да кандыдатаў і кандыдатак на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Акрамя чаканых пытанняў да прэтэндэнтаў пра іх стаўленне да ЛГБТК+, у СМІ з'явілася інфармацыя пра аднаполыя сэксуальныя сувязі аднога з патэнцыйных кандыдатаў. Ніякіх доказаў гэтаму прыведзена не было.

Ужо сталася традыцыйным адзначэнне дыпламатычным корпусам, акрэдытаваным у Рэспубліцы Беларусь, 17 траўня – Міжнароднага дня барацьбы з гамафобіяй, трансфобіяй і біфобіяй.

Загалоўкі СМІ на гэтую тэму:

У Мінску амбасада Вялікабрытаніі зноў вывесіла вясёлкавы сцяг.

Трэці год запар на будынку амбасады Брытаніі ў Мінску – вясёлкавы сцяг.

Паглядзіце: відэа ў падтрымку ЛГБТК-людзей запісалі 18 дыпламатаў.

Кіраўнікі дыпмісіяў у Беларусі запісалі відэазварот супраць дыскрымінацыі ў адносінах да ЛГБТІ-супольнасці.

Ці будзе Караеў каментаваць ЛГБТ-сцяг на брытанскай амбасадзе?

У святле гэтых навінаў выбітнай выглядае аб'ява на беларускай гандлёвай анлайн-пляцоўцы: Сцяг ЛГБТ вясёлкавы 90х135 см

Міжнароднаму дню барацьбы з гамафобіяй і трансфобіяй быў прысвечаны чарговы выпуск Першага беларускага гей-падкаста.

Другі квартал 2020 года апынуўся багацейшым на электаральныя падзеі ў нашым рэгіёне.

Акрамя беларускіх выбараў і расійскага галасавання пра папраўкі ў Канстытуцыю (тэма не ўзгадвалася ў беларускіх СМІ ў ЛГБТ-кантэксце) у Польшчы адбываюцца выбары прэзідэнта краіны.

Першы тур адбыўся 28 чэрвеня 2020 года. Другі тур прызначаны на 12 ліпеня.

Дзейны прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда часта ўзгадваецца ў медыя Беларусі з адлюстраваннем яго пазіцыі ў адносінах да ЛГБТ.

Яго нядаўнія гамафобныя выказванні выклікалі шквал абурэння на Захадзе.

Дуда сказаў наконт гомасэксуалаў, лесбіек, бісэксуалаў, трансгендарных асобаў: “Нас спрабуюць пераканаць, што гэта людзі. Але гэта усяго-толькі ідэалогія.”

Галоўны палітычны апанент Дуды Рафаль Тшаскоўскі падпісаў так званую “Хартыю ЛГБТ+” у падтрымку прадстаўнікоў гэтай сацыяльнай групы.

Падчас перадвыбарчай кампаніі ён, аднак, вырашыў не выпячваць гэтую тэму, каб не адпужнуць кансерватыўных выбаршчыкаў.

Загалоўкі беларускіх СМІ на гэтую тэму:

Дуда польская.

Хто дапаможа Дудзе.

У Польшчы абіраюць новага прэзідэнта. Назіральнікі лічаць, што пераможца стане вядомы пасля другога тура.

Дасье ў карыкатурах: Інтрыга за Бугам.

Яшчэ адна, на гэты раз непалітычная тэма, узгадвалася даволі часта ў прывязцы да ЛГБТ-тэматыкі. Увага беларускіх СМІ была скіраваная на мультфільмы.

Прапануем загалоўкі:

Дзіцячы тэлеканал нацякнуў, што Губка Боб – гей. Сацсеткі ўжо не спыніць.

Кінастудыя Disney выпусціла мультфільм пра гея.

Вы здзівіцеся, але сучасныя мульцікі не такія і бяскрыўдныя. Эксперт распавяла, што з імі не так.

У чэрвені адзначаўся т.зв. Pride Month, або Месяц гонару. Тое, як ён святкаваўся ва ўмовах пандэміі, можна прачытаць у падборцы матэрыялаў па гэтай спасылцы.

Далей прапануем Дайджэст, напрыканцы якога змяшчаем вынікі працы сайта **GayPress.eu** за II квартал 2020 года.

Адмыслова згадаем старт відэапраекта **GayPress Talks**, у першым роліку якога гомасэксуалы распавядаюць пра дыскрымінацыю ў іх жыцці.

Таксама раім азнаёміцца з матэрыяламі тэматычных сайтаў, якія не былі адлюстраваныя ў Дайджэсце, з-за таго, што ў яго ўключаюцца толькі навіны, якія з'яўляюцца ў СМІ агульнай накіраванасці **Журналисты за талерантнасць, Сустрэча, Makeout.**



Бабарыка пра аднаполыя шлюбы

«Права людзей на свае паводзіны і свой выбар у жыцці – неад'емнае. Тое ж датычыцца і аднаполых ўлюбаў», - цытуе Віктара Бабарыку TUT.BY.

«Правы чалавека павінны захоўвацца ў абавязковым парадку. Незалежна ад таго, да якіх супольнасцяў ён належыць. Мы маем права на тых партнёраў, якіх мы абіраем», адзначана ў публікацыі KYKY.ORG аб прамым эфіры палітыка.



Валанцёрства на дыстанцыёнцы: 7 варыянтаў дапамагчы

Вось якіх канкрэтна людзей шукаюць: людзей з ЛГБТК-супольнасці, гатовых паразважаць на тэму, чаму статыстыка паказвае высокі працэнт дэпрэсій, разладаў харчовых паводзін, дысмарфафобіі, трывожных разладаў у ЛГБТК-людзей.

https://34mag.net/post/valancyorstva-na-dystancyyoncy



«Называлі мяне "п*дар", "гамасек". Але ўсё нашмат больш складана»

Гісторыя Глеба – пра агендарнасць, булінг даўжынёй у 11 год, дзявочыя сукенкі, дыскрымінацыю ўнутры ЛГБТ-супольнасці і мужнасць маці, якая прыняла свайго сына.

https://citydog.by/post/zhb-agender/



Бясплатнае ЭКА як катастрофа дэмаграфічнай палітыкі

Доступ да ЭКА і сурагатнага мацярынства – надзвычай важны для асобаў, якія жывуць у аднаполых партнёрствах. Для іх нараджэнне дзіцяці пры дапамозе ЭКА – практычна адзіны спосаб стаць бацькамі. І тут ЛГБТ-актывісты гатовыя пераадолець любы супраціў.

http://prolife-belarus.org/besplatnoe-eko-kak-katastrofa-demograficheskoj-politiki.html



«Інтэрнэт-суіцыд або рэальнае жыццё!» Гісторыя Ніка Анціпава, сузаснавальніка MAKEOUT

У дзень барацьбы з гамафобіяй 17 траўня Нік незапланавана вярнуўся ў Facebook – ён адчуваў, што ў гэты важны дзень мае быць бачным, як ніколі.

– Нягледзячы ні на што, я вырашыў казаць. Не толькі для сябе, але і для маіх хаўруснікаў і хаўрусніц, для ЛГБТК-руху.

https://oeec.by/people/tak-mozhno/na/



ЛГБТ-людзі — пра ізаляцыю да пандэміі

17 траўня — Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй и трансфобіяй.

ЛГБТ-людзі распавялі, чаму яны знаходзіліся ў ізаляцыі яшчэ да пандэміі каранавірусу.

https://www.svaboda.org/a/30617312.html



Што такое інклюзія? (відэа)

Стварэнне камфортных умоў для жыцця важна самым розным групам: бацькі з малымі дзецьмі, людзі сталага веку, людзі з рознымі захворваннямі, ЛГБТ, мігранты і іншыя.

Розныя сацыяльныя групы важна ўключаць не толькі ў адукацыю і працу (пра што памятаюць амаль усе), але і ў іншыя сферы жыцця: культура, ахова здароўя, спорт, сэкс, вандроўкі.

https://humanlibrary.by/shto-takoe-inklyziya/



Сумесная заява “Рады бацькаў” і “Бацькоўства”

“Мы выказваем сур’ёзную заклапочанасць актыўнасцю ЛГБТ-супольнасці, якая, на нашу думку, разбурае традыцыйныя маральныя падваліны беларускага грамадства і пагражае нацыянальнай бяспецы нашай краіны. Таксама мы супраць вольнага доступу непаўнагадовых да фільмаў, мультфільмаў, серыялаў і іншай прадукцыі, дзе дэманструюцца адносіны ЛГБТ.”

https://otcovstvo.by/news/219-sovmestnoe-zayavlenie



Amnesty International прадставіла справаздачу пра правы чалавека ў Беларусі

У раздзеле, прысвечаным Беларусі, крытычна ўзгадваецца наяўнасць смяротнагаа пакарання, абмежаванні ў інтэрнэце і абмежаванні свабоды СМІ, парламенцкія выбары, дыскрымінацыя цыганоў і прадстаўнікоў ЛГБТ, а таксама жорсткія прысуды паводле наркаартыкулаў Крымінальнага кодэкса Беларусі, у тым ліку непаўнагадовым.

https://reform.by/amnesty-international-predstavila-doklad-o-pravah-cheloveka-v-belarusi



ТЭСТ: Наколькі вы ўстойлівыя да стэрэатыпаў пра ЛГБТ?

У тэсце сабраныя папулярныя сверджанні пра лесбіек, геяў, бісэксуалаў і трансгендараў. І з іх складзеныя 12 пытанняў. Праверце сябе на стэрэатыпаўстойлівасць!

https://udf.by/news/tests/211381-test-naskolko-vy-ustojchivy-k-stereotipam-ob-lgbt.html



Вяселле мае значэнне: чаму варта павучыццца ў ЛГБТК-параў у сэксе і адносінах

Однополые пары только недавно получили право заключать брак – да и то не везде, поэтому они относятся к вопросу максимально серьезно, в то время как гетеро воспринимают свое право на брак как само собой разумеющееся. Многие заявляют: «Нам не нужна бумажка, чтобы подтвердить свои намерения», – а однополые пары на седьмом небе от счастья, что государство может закрепить их отношения официально. Citydog.by



6 прыкладаў таго, як зоркі дапамагаюць актывістам

DOTYK выпусціла серыю паштовак-постараў з партрэтамі знакамітых беларусаў і іх словамі ў падтрымку ЛГБТ-людзей.

Група Shuma і кампанія памяці Мішы Пішчэўскага «Справа Пі_» запусцілі бестэрміновы флэшмоб #superparents, які прысвечаны ўзаемаадносінам бацькоў і дзяцей, праблеме цкавання і нянавісці ў адносінах да ЛГБТ-людзей.

https://34mag.net/post/yak-zorki-dapamagayuc-aktyvistam



Камісія па этыцы БАЖ: што гэта такое і як працуе

Мы разглядалі на камісіі па этыцы выпадак, калі паступіла скарга на вельмі грубы каментар да зацемкі на тэму ЛГБТ. Па ходзе расследавання рэдакцыя адразу ж прызнала сваю памылку і прыбрала гэты каментар. Аднак, па праўдзе кажучы, я не разумею, навошта публікаваць рэчы, якія правакуюць выбух ксенафобіі, павышаюць агрэсію ў грамадстве.

БАЖ



Ці ёсць у Беларусі ЛГБТ-прапаганда сярод моладзі?

Вулічная апытанка ў Мінску. Паглядзіце, што думаюць мінчукі пра ЛГБТ-прапаганду.

http://www.legin.by/posts/197

ВЕЧЕРНИЙ МОГИЛЁВ

«Каранавірус разбурыў ідэалогію ЛГБТ»

«А дзе ж цяпер нашыя ЛГБТ, барацьбіты з Харві Вайнштэйнам і прадстаўнікі ста сарака васьмі гендараў? Нешта ўсе гэтыя левакі прыціхлі і прысмірэлі! Не бачна іх не чутна!» Спасылка

«Пандемія вяртае свет да традыцыйных каштоўнасцяў»

«Адмененыя «маршы гонару», удар па сусветным гей-лобі, вяртанне да традыцыйных сямейных каштоўнасцяў: пасля эпідэміі каранавірусу свет зменіцца ў лепшы бок.» Спасылка

GayPress.eu

У II квартале 2020 года GayPress.eu застаецца адзіным ЛГБТ-парталаам у Беларусі са штодзённай перыядычнасцю некалькіх публікацыяў (навіны Беларусі і свету, беларускамоўны кантэнт, аўтарскія публікацыі) і колькасцю ўнікальных наведнікаў за чэрвень 2020 года - 24 441 асобаў (паводле дадзеных Google Аналітыка).

Дала вынікі рэдакцыйная праца на **Яндекс. Дзен**. У чэрвені там было зарэгістравана **158 629** паказаў і больш як **30 000** дачытванняў. Аўдыторыя склала больш за **26 000** асобаў. І лічбы ўвесь час растуць.

У TikTok у чэрвені было зарэгістравана больш за **55 000** праглядаў 12 відэа. 4 відэа набралі больш за 10 000 праглядаў

Працягваецца медыя-кампанія **Не стэрэатыпам**, мэта якой дапамагчы пазбавіцца падставовых стэрэатыпаў, якія існуюць у СМІ ў адносінах да ЛГБТ-супольнасці.

Тэксты, якія выйшлі ў гэтай рубрыцы:

Ці Біблія не асуджае геяў? Ці гэта чарговыя стэрэатыпы?

У Садоме геяў не было!..

Вяселлі геяў – гэта проста, утульна і цёпла. Фотарэпартаж, які абвяргае стэрэатыпы

Хто ў гей-пары мужчына, а хто жанчына?

Ці дзеці геяў робяцца геямі?

Бісэксуал = неразборлівы?…

Біфобія і монасэксізм. Ці існуе наогул бісэксуальнасць?

Як зразумець, хто такі пансэксуал і пазбавіцца ад стэрэатыпаў?

Стэрэатыпы беларусаў пра ЛГБТ-пары. Частка 1

Стэрэатыпы беларусаў пра ЛГБТ-пары. Частка 2

Тэст: наколькі вы ўстойлівыя да стэрэатыпаў пра ЛГБТ?

Стэрэатыпы пра ЛГБТ-людзей у СМІ Беларусі

За II квартал 2020 года на GayPress.eu з'явіліся 150 матэрыялаў: аўтарскія тэкставыя / відэа / аўдыё публікацыі; навіны Беларусі і свету; беларускамоўны кантэнт.

GayPress.eu

Мы ў сацыяльных сетках

Facebook

ВКонтакте

Яндекс. Дзен

Twitter

E-mail: GayPress.eu@gmail.com



GayPress.eu